Як зьдзек, выглядае зьніклы *зубр* заміж традыцыйнага аленя на гербах Горадні й Гарадзенскай губэрні часоў Расейскай імпэрыі.

Літаратура XX стагодзьдзя ня надта цікавілася *зубрамі*. Калі хто і апеў гэтую жывёлу, дык Уладзімер Караткевіч. Ён жа ўвёў ува ўжытак і яшчэ адно, пераноснае значэньне слова *зубр* — чалавек, які ўпарта трымаецца сваіх адсталых поглядаў. На шчасьце, гэткае значэньне не надта каб прыжылося. І *зубрамі* мы ўсё ж хутчэй назавем Сапегу, Багушэвіча, Крэчэўскага, а нават і самога Караткевіча, чым таго ж Лукашэнку.

У прыродзе *зубр* жыве 35–50 гадоў. Ягоны названы брат, беларускі цяжкавагавы аўтамабіль „*Зубр*“, столькі не працягнуў. Ён выйшаў з ужытку й зьнік з рэальнага жыцьця. Як зьніклі зь яго многія так званыя „дасягненьні Савецкай Беларусі“ зь ейнымі *зубрамі* ад палітыкі, эканомікі ці культуры.

А вось новых нацыянальных *зуброў* у грамадзкім жыцьці дзяржавы канца гэтага стагодзьдзя назаве стагодзьдзе наступнае.

# Зуброўка

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Зуброўка* — духмяная трава, якая расьце ў лясох і на лугавінах — атрымала сваю назву праз тое, што яна — улюбёная ежа волатаў беларускага лесу: зуброў. А яшчэ яна — араматычны сродак, які ўжываецца для... Напэўна, кожны жыхар Беларусі мог бы скончыць гэтую фразу, нават не падумаўшы, што апрача гарэлкі *зуброўкавы* водар можна знайсьці ў старых рэцэптах пірагоў, печываў і іншых прысмакаў. Пахам *зуброўкі* дыхалі закаханыя ў вечаровых стагах, але пра яго чамусьці ніколі не пісалі паэты.

Укінутая ў гарэлку жоўтая або зялёная сьцяблінка *зуброўкі*ператварае яе ў трунак найвышэйшай якасьці. Напой „*Зуброўка*“ — сувэнір зь Беларусі, які вязуць нашыя суайчыньнікі, едучы куды-небудзь у замежжа. Гэткім чынам, „*Зуброўка*“ — гэта ў пэўным сэнсе візытоўка Беларусі.

„Вось сымбаль твой, забыты краю родны“, — выгукнуў словамі Багдановіча адзін мой знаёмы, уздымаючы над галавой фірмовую пляшку. „А што? — адказаў другі. — Ня трактар жа „Беларусь“ везьці ў падарунак“.

Налепка на „*Зуброўцы*“, як правіла, упрыгожаная выявамі зуброў, і неабазнаны чалавек можа зразумець гэта як намёк: *зубры* ядуць гэтую траву, і яны моцныя. Хочаш быць моцным — пі „*Зуброўку*“. Між тым гатунку *зуброўкі*, які ідзе на выраб гарэлкі, *зубры* не ядуць. Яны любяць іншую *зуброўку*, якая, хаця і аднэй сям'і з гэтай, але такога паху ня мае.

У 70–80-я гады „*Зуброўка*“ ўжывалася як падмазка перад хабарам, а то й як хабар. Яе скрынкамі выстаўлялі для ўсялякіх праверак, рэвізіяў і ўрачыстых сустрэчаў так званых патрэбных людзей. Кіраўнікі рознага кшталту і розных узроўняў, едучы на паклон хто ў Менск, хто ў Маскву, везьлі яе з сабой і гэткім чынам залагоджвалі справы, атрымлівалі ўзнагароды або „ярлыкі на княжаньне“.

„*Зуброўка*“ і сапраўды магла б стаць каралевай беларускіх напояў, як „Бехераўка“ ў чэхаў, „Пярцоўка“ ў украінцаў, ці каралём, як „Рыскі бальзам“ у латышоў... Але ня стала...